So, having analyzed the articles we came to the conclusion that American press influences its readers more greatly then the British press. In the articles we can see not only the statement of this or that fact but also calls to certain actions and attitude to Iran. They try to persuade and sometimes even overstate danger of the present nuclear enrichment. This obviously can lead to a military action in Iran soon.

At the same time the British want to be only observers and pay attention to their antimilitary intentions. Great Britain keeps neutrality and tries to find compromise in Iran's problem. Maybe it's made withdrawals after Iraq war and now it is more careful on the international arena.

Attitude of the US and Great Britain to Russia is also quite different. Britain treats it as a careful country, which doesn't want the next «storm in the desert», but the US suspects Russia in cupidity and wants it to obey them.

So, we can see how different interpretations of one and the same event can be according to the national interests and how opinions of powerful people can influence public and journalists' opinions.

Such an approach to news coverage is not good for ordinary people, because they don't understand the real situation. But, on the other hand, the American or the British government can influence the consciousness of its nation and unite people of this or that country. But what kind of influence is it: positive or negative? The question is open. Each person can make a decision of his/her own.

## ЭКРАННЫ ВОБРАЗ АГРАПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПРАГРАМЫ ЗАТ «СТАЛІЧНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ» «МІНШЧЫНА. ЛЮДЗІ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ»

**А. У. Закшэўская**

Журналісты-аграрыі пры асвятленні пытанняў аграпрамысловага комплексу краіны падпарадкоўваюцца шэрагу дакументаў. Найбольш важнай і істотнай з'яўляецца «Дзяржаўная Праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гады». Дакумент распрацаваны ў адпаведнасці з Загадам Прэзідэнта і змяшчае комплекс мер і механізмаў, якія скіраваны на паляпшэнне сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на вёсцы і павышэнне жыццёвага ўзроўню сельскага насельніцтва.

Новы імпульс фарміраванню канкурэнтаздольнай рынкавай аграрнай эканоміцы надасць «Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гады». Асноўныя накірункі гэтага дакумента былі адобраны ўдзельнікамі трэцяга Усебеларускага народнага сходу.

У пачатку леташняй вясны была зацверджана «Рэспубліканская Праграма аснашчэння сельскагаспадарчай вытворчасці сучаснай айчыннай тэхнікай на 2005–2010 гады і меры па яе рэалізацыі». І ўжо праз тыдзень Савет Міністраў рэспублікі не толькі падтрымаў яе, але і падмацаваў фінансава (на закупку новых машын і абсталявання выдаткаваў 890 мільярдаў рублёў са сродкаў рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі), а таксама «из областных бюджетов и за счет кредитных ресурсов». Праграма таксама з'яўляецца значнай падтрымкай аграпрамысловага комплексу краіны.

Толькі добрыя карэктывы ў жыццё і побыт сельскіх працаўнікоў уводзяць і шматлікія рашэнні Мінаблвыканкама і Міністэрства па сельскай гаспадарцы і харчаванню. Дзякуючы загаду сталічнага аблвыканкама ад 21 сакавіка 2006 года «Аб умовах правядзення штогадовага спаборніцтва сярод гарадоў і раёнаў Мінскай вобласці на лепшую пастаноўку работы ўстаноў культуры і мастацтва», значна палепшылася якасць работы дамоў і палацаў культуры, гурткоў, бібліятэк і музеяў.

Адабрэнне і падзяку з боку шматдзетных матуль выклікала нядаўняе пастанаўленне Мінаблвыканкама «Аб аказанні матэрыяльнай падтрымкі шматдзетным маці, узнагароджаным Ордэнам маці».

Але ўсе гэтыя праграмы, загады, дакументы, добрыя намеры так і застануцца на паперы, не дойдуць да адрасата, іх не пачуе чалавек, калі журналісты не агучаць, не прасочаць ход дзеянння. А калі трэба – і пакрытыкуюць.

Сёння на тэлеэкране аграпрамысловы комплекс краіны прадстаўлены не вельмі багата: у праграме для вяскоўцаў і пра вяскоўцаў ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» – «Міншчына. Людзі, падзеі, факты»; «Зямельным пытанні», у тэлепраграме «Гаспадар» АТН) і адзінкавых тэматычных рэпартажах у праграме АНТ – «Нашы навіны» і «Рэгіён» (тэлеканал «ЛАД»).

*Тэлежурналісты праграмы «Міншчына. Людзі, падзеі, факты» кантактуюць з Міністэрствам унутраных спраў вобласці, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях, Мінаблвыканкамам, аддзеламі ідэалогіі гар- і райвыканкамаў.*

У «Міншчыне» знаходзіць адлюстраванне ход выканання рашэнняў Мінаблвыканкама, «Праграмы адраджэння вёскі на 2005–2010 гады», загады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, «Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі на 20006-2010 гады», важнейшыя і значныя для жыхароў рэспублікі падзеі палітычнага жыцця. У выпуску ад 20 студзеня 2006 года вядучы паведаміў пра абласную селектарную нараду,

якую ладзіў старшыня Мінаблвыканкама Мікалай Дамашкевіч. Размова ішла аб мерах па забеспячэнні ўстойлівага функцыянавання народнай гаспадаркі вобласці ў экстрымальных умовах надвор'я. Сёлетнім студзеньскім маразам прысвячаўся і шэраг відэасюжэтаў «Міншчыны».

Арганізацыя і правядзенне Трэцяга Усебеларускага народнага сходу не адзін тыдзень былі ў цэнтры ўвагі журналістаў. Карэспандэнты «Міншчыны» апавядалі пра тое, як у сельскай мясцовасці праводзяцца раённыя і гарадскія сходы ўпаўнаважаных па вылучэнні ўдзельнікаў ад сталічнай вобласці. Здымачныя групы дзяжурылі непасрэдна ў Палацы рэспублікі падчас важнай дзеі. Не пакінулі журналісты па-за ўвагай і важнейшае палітычнае мерапрыемства – выбары Прэзідэнта краіны. У праграме падавалася інфармацыя пра стварэнне ўчасткаў для галасавання на вёсцы, збор подпісаў ініцыятыўнымі групамі за кандыдатаў на пост Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ход галасавання.

Пытанні эканамічнага блоку складаюць не менш за пяцьдзесят працэнтаў выпуску. Супрацоўнікі рэдакцыі расказваюць пра сезонныя аператыўныя работы ў гаспадарках Міншчыны. Паказваюць, як на практыцы рэалізуюцца мерапрыемствы, запланаваныя ў «Праграме развіцця вёскі на 2005-2010 гады» – гэта скарачэнне колькасці стратных гаспадарак, узвядзенне аграгарадкоў, будаўніцтва жылля, якое вызначана Загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 «Аб дадатковых мерах па жыллёваму будаўніцтву на вёсцы і аб крыніцах яго фінансавання», газіфікацыя сельскіх населеных пунктаў, аснашчэнне медыцынскіх устаноў на вёсцы, дзейнасць прынцыпу «аднаго акна», новаўвядзенні ў сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва, а таксама выкананне сацыяльных стандартаў.

Па сваёй структуры «Міншчына» – тыповая інфармацыйная праграма, у якой вядучы знаёміць гледачоў з апошнімі навінамі вобласці, прадстаўляе рэпартажы карэспандэнтаў.

Адна з асаблівасцей праграмы – яе шырокая «геаграфія». Журналісты не лянуюцца наведваць шматлікія сельскія населеныя пункты 24-х раёнаў сталічнай вобласці.

Досыць разнастайна ў перадачы прадстаўлены інфармацыя, відэаінфармацыя, інтэрв'ю, рэпартаж, спецыяльны рэпартаж, рэпартаж-даследаванне, праблемны рэпартаж, замалёўка.

На жаль, у праграме не стае глыбіні аналізу, назіраецца схільнасць да канстатацыі фактаў. Часцей за ўсё расказваць даводзіцца толькі пра тыя гаспадаркі сталічнай вобласці, якія лідзіруюць па эканамічных паказчыках. Таму і атрымліваецца, што зімой і летам журналісты бываюць па адных і тых жа адрасах. Адсюль і рэзкае зніжэнне якаснага ўзроўню

інфармацыйных матэрыялаў, страта іх аператыўнасці, актуальнасці і аб’ектыўнасці, а таксама тэматычная абмежаванасць. Так, сёння сюжэтныя матэрыялы перадачы забыліся на першасную функцыю па вывучэнню і аналізу праблемы. Па-ранейшаму не хапае крытычных матэрыялаў, якія дазволілі б намаляваць аб’ектыўную карціну жыцця сталічных рэгіёнаў.

Ці знайшла праграма сваіх прыхільнікаў? Падчас камандзіровак і рэйдаў у раёны даведваешся, што сельскія працаўнікі глядзяць сваю праграму, у твар ведаюць не толькі дыктараў, але і карэспандэнтаў. А вось сярод гараджан сваю прыхільнасць да гэтай праграмы выказваюць толькі супрацоўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і камітэтаў Мінаблвыканкама. І глядзяць яны «Міншчыну», каб пасля адрапартаваць вышэйшым начальнікам або проста ўбачыць сябе. Бо ў «Міншчыне» усе яны – частыя госці.

Аўтар лічыць, што, мажліва, трэба разнастаіць праграму «Міншчына», напоўніць яе новымі рубрыкамі, крыху змяніць і саму канцэпцыю перадачы. Цікава было б, каб кожны дзень на тыдні меў сваю адметнасць. Напрыклад, па панядзелках – рубрыка «Зваротная сувязь». Можна гаварыць пра праблемы глыбінкі, цяжкасці, з якімі сёння даводзіцца сутыкацца вяскоўцам. Галоўны элемент гэтай рубрыкі – абавязковы каментарый спецыяліста, дасведчанага чалавека, яго адказ на крытычныя заўвагі.

У аўторак людзі яшчэ бадзёрыя, энергічныя. Яны прагнуць ведаў, новых уражанняў. Можна прапанаваць рубрыку «Гавораць назвы». Гэта падарожжа ў глыбінку. Гісторыя назвы вёскі і сённяшняе жыццё яе жыхароў.

Серада, па словах урачоў, лічыцца самым складаным днём. Наперадзе – яшчэ два працоўныя дні. Таму самы час адпачыць разам з рубрыкай «Чалавек Міншчыны маёй». Журналіст сустракаецца з таленавітым чалавекам, майстрам. У цэнтры ўвагі карэспандэнта – багаты душэўны свет. Абавязковае музычнае суправаджэнне надасць сюжэту лірычную, эмацыянальную афарбоўку.

Чацвер, здаецца, трэба прысвяціць моладзі Міншчыны. Юнакі і дзяўчаты, якія жывуць у глыбінцы, безумоўна, не менш адораныя і таленавітыя. Пра іх трэба гаварыць. Гэта толькі станоўча паўплывае на рэйтынг і аўдыторыю праграмы.

Пятніца – апошні дзень на працоўным тыдні. А значыць, самы час падвесці вынікі, абагульніць. У эфіры праграмы «Міншчына» можа быць троххвілінная рубрыка «Навіны тыдня». Цікавыя факты, каментарыі, падзеі. Дарэчы, яе можна было б замяніць нядзельнай выніковай

праграмай пра жыццё сталічнай вобласці. Магчыма, з запрашэннем госця ў студыю. Зноў жа, не чыноўніка, не старшыню вытворчага кааператыва. Гаварыць павінен просты чалавек. Трэба, каб матэрыялы былі больш насычанымі, аналітычнымі. Калі гэта падрыхтоўка да сяўбы, то адначасова зачапіць машынна-трактарны парк, насенне і наяўнасць кадраў. А не апавядаць пра гэта па чарзе.

Здаецца, што праграма пра жыццё вёскі, толькі тады займее пастаянную аўдыторыю, набудзе цікавасць, калі галоўнай дзеючай асобай перадач будзе просты чалавек-працаўнік.

## КОЛЛЕКТИВ И ИНДИВИДУАЛЬНОСТЬ: ПРОБЛЕМЫ ОРГАНИЗАЦИОННОЙ КУЛЬТУРЫ

**Е. В. Касперович**

Анализируя деятельность и высказывания некоторых белорусских менеджеров по персоналу, публикации в специализированных СМИ и онлайн изданиях, можно предположить, характер тенденции приобретает следующая ситуация. Командность, партисипативность и строгий коллективизм рассматриваются, во-первых, как лучший из возможных способов достижения практических результатов за счет синергетического эффекта, во-вторых, как идеальный вариант отношений. В качестве социального идеала, объекта и субъекта управления рассматривается т.н. *корпоративный человек*, идентифицирующий себя с организацией через усвоение корпоративных норм, идеалов и ценностей. *Корпоративный человек* выбирает свою позицию, цели и средства самореализации в соответствии с требованиями организации и приобретает социальную идентичность как ее представитель.

Гипотеза подтвердилась в ходе проведенного нами исследования, суть которого состояла в анкетировании на основании сплошной выборки 19 менеджеров по персоналу, принимавших участие в двух специализированных семинарах, организованных разными консалтинговыми фирмами. С точки зрения методологии такой вариант представляется вполне оправданным, поскольку получить статистическую информацию об общем количестве практикующих менеджеров по персоналу для проведения масштабного репрезентативного исследования не представляется возможным. Итак, среди ответов на вопрос о том, в чем респонденты видят главную задачу своей работы по развитию организационной культуры, были следующие:

- сделать так, чтобы персонал находил свое самовыражение в нашей компании;